*Раіса Зянюк*

# Рымска-каталіцкія брацтвы ў заходніх губернях Расійскай імперыі ў канцы XVIII – пачатку XX ст.

*Раїса Зянюк*

# Римо-католицькі братства у західних губерніях Російської імперії в кінці XVIII – початку XX ст.

*У статті досліджено форми римсько-католицьких братств у західних губерніях Російської імперії в кінці XVIII – на початку XX ст., основні напрями їхньої діяльності, а також політику імперської влади щодо можливості існування таких релігійних об'єднань віруючих.*

*Ключові слова: римсько-католицька церква, братства, Російська імперія, XVIII ст., XIX ст., XX ст., західні губернії.*

Дзейнасць рымска-каталіцкіх брацтваў з'яўлялася адной з найбольш распаўсюджаных формаў душпастырскай працы каталіцкага духавенства з вернікамі. Аднак, дадзены від дзейнасці каталіцкага касцёла, гэтаксама як і дзейнасць саміх брацтваў не знайшлі належнага адлюстравання ў гістарычнай літаратуры. У сувязі з гэтым, важнай з'яўляецца рэканструкцыя зместу дзейнасці брацтваў, асноўных накірункаў іх дзейнасці, а таксама магчымасцяў яе рэалізацыі адпаведна з канфесійнай палітыкай расійскага ўраду.

У канцы XVIII – пачатку XX ст. брацтвамі ў рымска-каталіцкім касцёле называліся таварыствы вернікаў, якія аб'ядноўваліся ў рэлігійных альбо дабрачынных мэтах і былі афіцыйна зацверджаны касцёлам. Мэтай брацтваў і іх членаў было пашырэнне і ўшанаванне канкрэтнай таямніцы веры альбо святых, выкананне хрысціянскіх учынкаў і хрысціянскае самаўдасканаленне. Прававы статус брацтваў у каталіцкім касцёле рэгуляваўся шэрагам дакументаў, згодна з якімі былі прынятыя наступныя правілы: 1) забаранялася ствараць больш чым адно брацтва з аднолькавымі альбо падобнымі

мэтамі і задачамі ў некалькіх касцёлах аднаго горада альбо вёскі, аднак розныя брацтвы маглі дзейнічаць нават пры адным касцёле; 2) для арганізацыі брацтва пры касцёле быў неабходны пісьмовы дазвол ад мясцовага біскупа з апісаннем мэтаў брацтва; 3) брацтвы маглі засноўвацца біскупамі альбо генераламі ордэнаў. Пры жаночых кляштарах дзейнасць брацтваў для свецкіх была забаронена; 4) са згоды ўсіх членаў брацтва яно магло быць пераведзена з аднаго касцёла ў другі; 5) усе брацтвы, нават тыя, якія дзейнічалі пры кляштарах, мог візітаваць біскуп. У адносінах да членаў брацтваў касцёльнае права вымала наступнае: 1) кожны ўступаючы ў брацтва павінен быў дакладна ведаць мэты і задачы брацтва, а таксама абавязкі яго членаў; 2) уступаць у брацтва з рэлігійных перакананняў; 3) насіць знак брацтва[1].

З'яўленне і рост колькасці брацтваў на беларуска-літоўскіх і ўкраінскіх землях адбываўся паралельна з развіццём парафіяльнай сеткі каталіцкіх храмаў і павелічэннем колькасці кляштараў. Найбольш інтэнсіўна гэтыя працэсы адбываліся ў XVII–XVIII ст. Аднак заснаванне новых брацтваў было характэрна таксама для канца XVIII – першай паловы XIX ст. Так, у Дагдэнскім касцёле Віцебскай губерні брацтва пад назвай св. Тройцы было заснавана ў 1792 г., у Осуньскім (Віцебскай губерні) ружанцовае брацтва – у 1818 г., а ў Індрыцкім (таксама Віцебскай губерні) з такой жа назвай ў 1852 г.[2]. Павелічэнне колькасці брацтваў было характэрным у знакавыя для каталіцкага касцёла ў Расійскай імперыі гады – напрыклад, падчас святкавання юбілейнага году (1826 г.), у год заключэння канкардату (1847 г.), прыняцця новага дагмату (1854 г.) і інш.

Найбольш распаўсюджанымі былі брацтвы, якія дзейнічалі пры кляштарных касцёлах. Манаскія ордэны яшчэ з сярэднявечча мелі дазвол на заснаванне ўласных брацтваў. Так, пры кляштарах і касцёлах кармелітаў традыцыйна дзейнічалі шкаплерныя брацтвы. Бернардзінскія кляштары арганізоўвалі брацтвы св. Арханёла Міхала і св. Ганны. Пры кляштарах усіх галінаў францысканскага ордэна (францысканцаў канвентуальных, капуцынаў, бернардзінцаў) звычайна дзейнічалі брацтвы св Антонія і паса св. Францыска[3]. Пры кляштарах дамініканцаў традыцыйна дзейнічалі ружанцовыя брацтвы. Пры парафіяльных касцёлах, у якіх працавалі дыяцэзіяльныя святары, брацтвы былі самыя розныя: пад назвай Бога (св. Тройцы, св. Духа і г. д.), марыйныя брацтвы і брацтвы пад патранатам святых.

Пры некаторых касцёлах дзейнічала некалькі брацтваў. Напрыклад, пры касцёле глыбоцкіх кармелітаў босых дзейнічала тры брацтвы: Маці Божай Шкаплернай, св. Юзафа і св. Барбары, а пры бердзічаўскім касцёле кармелітаў босых – 6 брацтваў: св. Тройцы, Шкаплернае, брацтва добрай смерці, св. Яна Непамука, св. апостала Тадэвуша і св. Тэклі[4].

Адметнасцю брацтваў з'яўлялася іх усесаслоўнасць. Па вялікім рахунку, брацтвы з'яўляліся адзінымі арганізацыямі, ў якіх прыналежнасць да канкрэтнага саслоўя не з'яўлялася абмежаваннем пры ўступленні[5]. Напрыклад, брацтва св. Тройцы пры Краслаўскім касцёле налічвала 79 чалавек, сярод якіх было 78 сялян і 1 дваранка[6], у Барысаўскім касцёле – сярод 59 чалавек, якія былі запісаныя ў брацтва, былі: «солдатка, мещанка, крестьянин, гражданин, титулярный советник, однодворец, благородный» і г. д[7].

Найбольш распаўсюджанымі ў заходніх губернях былі ружанцовае, шкаплернае і св. Тройцы брацтвы. Па стане на 1830 г. у Мінскай дыяцэзіі дзейнічалі 34 брацтвы[8]. У сярэдзіне 60-х гг. XIX ст. колькасць брацтваў у Мінскай дыяцэзіі засталася практычна нязменнай. Сярод 30 брацтваў, якія дзейнічалі пры 29 касцёлах дыяцэзіі, было 12 ружанцовых, 4 шкаплерных, 4 св. Тройцы, 2 св. Ганны[9] і інш. У гэты ж час па заходняй частцы Магілёўскай архідыяцэзіі налічвалася 22 брацтвы, з іх 14 ружанцовых, 2 шкаплерных, 5 сэрца Ісуса Хрыста[10] і інш. Да маларaспаўсюджаных адносіліся пахавальныя брацтвы (іх члены мелі абавязак удзельнічаць у пахаваннях) і брацтвы добрай смерці[11]. Па стане на другую палову 60-х гг. XIX ст. у Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай губернях дзейнічала каля 400 брацтваў, з іх 110 ружанцовых, 60 шкаплерных, 37 – св. Тройцы і інш.[12]

З сярэдзіны XIX ст. стала пашырацца колькасць брацтваў цвярозасці. Узнікалі яны па ініцыятыве святароў з мэтай супрацьдзеяння п'янству. Прыняцце ў гэтае брацтва звычайна адбывалася з вялікай урачыстасцю, падчас імшы кожны новы братчык атрымліваў медалік з надпісам «на памяць вядзення цвярозасці» з аднаго боку і выявай Маці Божай з іншага. Імя кожнага новага братчыка ўпісвалася ў спецыяльную кнігу. Члены брацтва цвярозасці прымалі зарок не ўжываць алкаголю, а таксама не наведваць піцейныя ўстановы. Аднак хуткае пашырэнне брацтваў цвярозасці і вялікая колькасць братчыкаў прыцягнулі пільную ўвагу расійскіх уладаў. Сабранні братчыкаў і іх сумесныя малітвы, на думку ўладаў, з'яўляліся прамой пагрозай рускай справе ў заходніх губернях[13] і былі забароненыя.

Улады Расійскай імперыі былі мала знаёмыя са структурай і арганізацыямі рымска-каталіцкага касцёла, таму да брацтваў залічвалі і тэрцыярыяў, якія не з'яўляліся імі згодна з кананічным правам[14]. Аднак у адносінах да іх прымянялася тое ж заканадаўства, што і да брацтваў, а не да манаскіх ордэнаў. У сваю чаргу, брацтвы з'яўляліся інтэгральнай часткай парафіі, ствараліся і дзейнічалі для больш зручнай арганізацыі працы святароў з вернікамі.

У канцы XVIII – пачатку XX ст., негледзячы на разнароднасць брацтваў, адрозненні паміж імі былі вельмі нязначнымі. Вельмі часта брацтвы адрозніваліся выключна назвай, а функцыянаванне канкрэтнага брацтва пры вызначаным касцёле вызначалася толькі традыцыяй. Аднак у дзейнасці ўсіх брацтваў можна выдзеліць 3 асноўныя накірункі: малітоўную, дапаможную і дабрачынную.

Малітоўная дзейнасць. Рэгулярная, вызначаная статутам і традыцыяй брацтва малітва абавязвала кожнага братчыка. У залежнасці ад брацтва, адрозніваўся комплекс штодзенных малітваў і іх інтэнцыя. Да абавязкаў братчыкаў належаў таксама абавязковы ўдзел у нядзельных і святочных імшах, а таксама ў залежнасці ад брацтва – удзел у дадатковых набажэнствах (ружанцы, літаніі і г. д.). У сваіх справаздачах аб дзейнасці брацтваў святары, якія імі займаліся, так характарызавалі гэты від дзейнасці: «Цель братства св. Троицы состоит в следующем: почитать Бога в св. Троице единого и предаться его Провидению, по воскресеньям св. Троице отправлять молебствие, и молиться за живых и умерших (...) наконец исповедываться и причащаться св. Тайн с видом индульгенции» (Краслаўскі касцёл Віцебскай губерні); «Совершенствовать в добродетелях христианских, усердно исполняя заповеди Господни и Церковныя, приобретать истинную любовь Бога и ближних, чтобы рожанец на чётках говорить с рассуждением и главнейших черт и таинств жизни Иисуса Христа, избегать ложной присяги, Богохуления, проклятия и т. п. пороков, и по возможности исповедываться и причащаться св. Тайн, в главнейшие праздники Иисуса Христа и Божией Матери» (ружанцовае брацтва ў Аглоне Віцебскай губерні), а ўва ўсіх брацтвах Люцынскага павета мэтай значылася толькі «маліцца Богу»[15].

Дапаможная дзейнасць – заключалася ў розных відах працы на карысць касцёла. Таксама да гэтага накірунку залічваецца дапамога святару пры набажэнствах, якую традыцыйна ажыццяўлялі члены брацтваў. Менавіта братчыкі арганізоўвалі працэсіі са свечкамі і

харугвамі. Як вынікае з дакументаў, некаторыя брацтвы ствараліся выключна для здзяйснення паслугаў падчас набажэнстваў (такім чынам, яны не былі брацтвамі ў дакладным гэтага слова значэнні). Такія функцыі, напрыклад, спаўнялі брацтвы пры Дараўскім, Новамышскім і Пінскім касцёлах. «Братство при Даревском костёле находится 30 лет для прислуг в костёле, но никаких патентов, булл и уставов не имеют» (Дарава), «Братство Непорочного Зачатия Преблагородной Девы существует, учреждено Виленским епископом Коссаковским в 1800 г. с целью для прислуги костёльной» (Новая Мыш). «В Пинском костёле братство избирается из среди себя единственно для удержания костёльного порядка»[16].

У некаторых выпадках братчыкам давяраліся ключы ад касцёла (напр., брацтва св. Тройцы пры Докшыцкім касцёле). Там жа братчыкі адказвалі за збор грошай падчас набажэнстваў[17]. Дапаможнай мэце служылі таксама ўласныя касы брацтва, якія мелі большасць з іх. У залежнасці ад брацтва складкі ў касу маглі быць дабраахвотных памераў альбо дакладна вызначаныя. Так, члены ружанцовага брацтва пры Новамышскім касцёле і Маці Божай Шкаплернай пры Стваловіцкім касцёле ўносілі ў касу штогод па 10 капеек, ружанцовага пры Крошынскім касцёле – 15 капеек у год, ружанцовага пры Сваятыцкім касцёле – па 20 капеек[18]. Існавалі таксама бедныя брацтвы, якім, наадварот, дапамагаў святар. Так, для брацтва пры Стваловіцкім касцёле «плябан фунтаў 30 і харугваў 3 справіў і арнат пад тытулам братчыкаў, і цяпер свечкі дае калі не хапае, бо складкі, г. зн. ахвяра вельмі малыя. Яны збіраюцца у скарбонку братчыкаў за двумя ключамі»[19] (*пераклад з польск. – аўт.*). Грошы з касы расходаваліся выключна для рэлігійных мэтаў. За іх братчыкі набывалі для сябе свечкі, якія выкарыстоўваліся падчас працэсій, на алтарах і для асвятлення касцёла, «на костёльные вина, воск и лампадное сало, свечи белые, рызы и тому подобное», «на покупку свечей, ламп и мелкие починки»[20]. У некаторых выпадках брацтвы арганізоўвалі спецыяльныя мерапрыемствы па зборы ахвяраванняў на той касцёл, пры якім яны дзейнічалі. Так, члены Ракаўскага брацтва «по праздничным и торговым дням, со значками и барабанами, расхаживают по местечку и собирают с доброхотных дателей деньги, обращаемыя на римско-католический костёл»[21].

Дабрачынная дзейнасць. Дабрачыннасць брацтвамі і іх членамі рэалізавалася ў 2 накірунках: унутраным і знешнім. «Унутраная» дабрачыннасць ажыццяўлялася ў адносінах да членаў брацтва

альбо іх блізкіх. Так, у выпадку смерці члена брацтва, яго сям'я магла разлічваць на ўрачыстае пахаванне і матэрыяльную дапамогу, велічыня якой залежала ад магчымасцяў брацкай касы.

Асноўным праяўленнем знешняй дабрачыннасці была раздача міласціны бедным асобам і жабракам. У статутах брацтваў адзначалася, што братчыкі павінны «исполнять по христианскому учению Богоугодныя и человеколюбивые дела, как то: давать милостыню нищим, пока есть жизнь и хоронить их тело по смерти, и т. п.»[22]. Міласціну жабракі атрымлівалі ў нядзельныя і святочныя дні як асобна ад братчыкаў, так і ад брацтваў увогуле. Менавіта на такую мэту прызначалася частка касы брацтва пры Ракаўскім касцёле[23]. Акрамя дробных грашовых успамогаў братчыкі, згодна са статутамі брацтваў, павінны былі аказваць асабістую рэгулярную дапамогу патрабуючым асобам. Таму дадаткова кожны братчык, па меры сваіх магчымасцяў, стараўся дапамагчы бедным ежай альбо вопраткай.

Да спецыфічных формаў брацкай «знешняй» дабрачыннасці адносяцца традыцыі Юравіцкага пахавальнага брацтва. Звычайна, пры пахаванні заможных асобаў за кандукт падчас пахавання братчыкі атрымлівалі грошы, палова з якіх дзялілася паміж імі, а другая – адпраўлялася ў касу брацтва. Пры пахаванні бедных асобаў, якія не маглі заплаціць братчыкам, пахаванне адбывалася бясплатна, а братчыкі карысталіся грашамі з супольнай касы, выдзяляючы пэўную суму кожнаму удзельніку пахавальнай працэсіі[24].

У параўнанні з дзейнасцю праваслаўных брацтваў, асабліва тых, якія існавалі ў XVI–XVII ст., па-за рэлігійная дзейнасць каталіцкіх брацтваў характарызавалася нізкай актыўнасцю. Адзінкавымі былі выпадкі навучання братчыкамі дзяцей грамаце[25]. У дадатак, дадзеныя ініцыятывы рэалізаваліся выключна канкрэтным членам брацтва, але не з'яўляліся справай, якой брацтва займалася згодна са статутам. Адзіным брацтвам, якое шырока займалася па-за рэлігійнай дзейнасцю, было брацтва міласэрнасці ў Вільні. У брацтва ўваходзілі бедныя і жабракі з горада, якія збіраліся пры касцёле св. Яна[26].

Згодна з кананічным правам каталіцкага касцёла дзейнасць канкрэтнага брацтва зацвярджалася Папам Рымскім. З 1794 г. у Расійскай імперыі быў уведзены прынцып, згодна з якім брацтвы зацвярджаліся епіскапам без узгаднення са свецкімі ўладамі.

Масавая касацыя кляштараў пасля паўстання 1830-31 гг. прывяла да спынення дзейнасці тых брацтваў, якія дзейнічалі пры закрытых кляштарных касцёлах. Аднак, самі брацтвы як арганізацыі вернікаў знаходзіліся па-за межамі ўвагі ўладаў да 1864 гг. Да таго часу яны функцыянавалі згодна з ўнутраным правам рымска-каталіцкага касцёла.

Паўстанне 1863–1864 гг. выклікала чарговую хвалю рэпрэсіўных мераў у адносінах да каталіцкага касцёла. Сярод іх у асобную групу выдзяліліся меры адносна брацтваў. У групу падазроных арганізацый брацтвы трапілі па шэрагу прычын. Па-першае, брацтвы з'яўляліся арганізацыямі, якія ўлады не маглі надзараваць, па-другое, яны аб'ядноўвалі людзей усіх саслоўяў, па-трэцяе, большасць брацтваў мела ўласную касу і непадкантрольныя ўладам сродкі. Па-чацвертае, урад не меў паняцця аб сутнасці, мэтах, задачах і дзейнасці брацтваў, што, у сваю чаргу, выклікала сур'ёзнае занепакоенне іх дзейнасцю.

Пытанне аб рымска-каталіцкіх брацтвах было ўзнята М. Мураўёвым ў 1864 г.[27]. Першапачатковыя мерапрыемствы тычыліся выключна збору звестак і падліку колькасці брацтваў і, па меры магчымасці, колькасці братчыкаў на беларуска-літоўскіх землях. Наступны раз пытанне аб дзейнасці брацтваў паўстала ў 1866 г. у рэвізійнай камісіі, дзе абмяркоўвалася, наколькі да брацтваў могуць прымяняцца дзяржаўныя правілы адносна палітычных таварыстваў. У чарговы раз пытанне паўстала ў 1867 г., калі мінскаму, ковенскаму, віцебскаму і магілёўскаму губернатарам была напраўлена цыркулярная прапанова аб дастаўленннні звестак пра брацтвы і аб скасаванні тых з іх, якія не маюць дзяржаўнага дазволу на дзейнасць[28].

Вышэйзгаданыя прычыны выклікалі масавыя распараджэнні губернатараў да біскупаў і паліцэйскіх спраўнікаў аб прадстаўленні звестак аб існуючых брацтвах, іх мэтах і задачах, кім і калі яны былі зацверджаны, а таксама аб палітычнай добранадзейнасці братчыкаў («при каких именно костёлах находятся означенные братства, с которого времени они существуют, с чьего разрешения каждое учреждено и для какой цели, каким уставом или инструкциею руководствуются и куда именно обращаются деньги собираемыя жертвуемыя братчиками, равно как и все другия сведения к этому предмету относящиеся, а также какого поведения и благонадёжны ли в политическом отношении самые братчики»)[29].

У выніку аказалася, што адзіным на той час брацтвам, якое мела імператарскі (Паўла І) дазвол на існаванне было брацтва немцаў-каталікоў пад назвай св. Марціна, заснаванае яшчэ ў XVII ст. пры касцёле св. Ганны ў Вільні. У яго ўваходзіла толькі нямецкае насельніцтва, а імператарская зацверджанне забяспечыла брацтва і штогадовымі датацыямі ад дзяржавы ў памеры 90 руб.[30].

На іншыя пастаўленыя губернатарамі пытанні адказы адрозніваліся. Калі ад біскупаў губернатары атрымлівалі лісты з тлумачэннем сутнасці брацтваў, пералікам мэтаў і задачаў, а таксама абавязкамі братчыкаў, то некаторыя паліцмайстары пачыналі шукаць у дзейнасці брацтваў палітычны падтэкст. Так, па адзначэнні ваеннага начальніка Навагрудскага павета «братства составляются из числа местных прихожан, которые хотя явно и незамечены в распространении между православными Католицизма и поддержания польской пропаганды, но как полагать нужно, устроены таковыя лишь для означенной цели. Что же касается политической благонадёжности братчиков, то хотя оныя и ни в чем не замечены, но за благонадёжность их ручаться нельзя, как некоторые заявили себя в подаче прошения Главному Начальнику Края об возврате упразднённого Мирского костёла минуя ближайшее Начальство»[31]. Ваенны начальнік Мазырскага павета адзначаў, што «из рассказов лиц, бывших в Мозыре в в 1863 году свидетельствующих о том, что в костёле пелись гимны, можно с полною вероятностью заключить, что братчицы были деятельными участницами в этих музыкальных демонстрациях»[32].

Аднак нават спадзеючыся адшукаць палітычны падтэкст у дзейнасці брацтваў, пераважная большасць спраўнікаў і ваенных начальнікаў рапартавалі аб іх выключна рэлігійным характары. Так, ваенны начальнік Дынабургскага павету ў рапарце адзначаў, што «в братствах никто из помещиков не состоит, а только одни крестьяне, что с самого начала мятежа, как мне достоверно известно, ничего бурного не происходило (...) крестьяне всегда были верны законному правительству»[33]. У большасці рапартаў адзначалася, што братчыкі ў палітычных адносінах «добранадзейныя», а таксама аб тым, што «вообще в деятельности этих, так называемых, братчиков, не обнаружено до настоящего времени ничего предрассудительного. За поведением их, во всяком случае, имеется строгое наблюдение»[34].

Негледзячы на пераважна станоўчыя характарыстыкі братчыкам, тлумачэнні на што расходуюцца грошы з брацкіх касаў, высвятленне мэтаў дзейнасці брацтваў; тыя з іх, якія не маглі прадставіць доказаў іх зацверджання свецкімі ўладамі было загадана ліквідаваць. 20 красавіка 1868 г. Віленскі, Ковенскі, Мінскі і Гродзенскі генерал-губернатар выдаў распараджэнне аб закрыцці ўсіх брацтваў пры касцёлах. Усе эмблематычныя знакі брацтваў і кнігі, якія ім належалі, прызначаліся да спалення[35]. Цыркуляр ад 31 мая 1868 г. абавязваў дэканаў і пробашчаў зачытаць у касцёлах распараджэнне аб закрыцці брацтваў. Пасля гэтага ў членаў брацтва бралі распіску аб азнаямленні з цыркулярам і брацтва лічылася скасаваным.

Негледзячы на масавыя закрыцці, брацтвы працягвалі існаваць. Забарона дзейнасці брацтваў прывяла да таго, што яны сталі існаваць тайна, падобна як і забарона дзейнасці каталіцкіх школаў выклікала ўзнікненне тайнага навучання. Кантраляваць працэс ліквідацыі было дастаткова складанай справай, паколькі, як ўжо адзначалася, асноўным зместам дзейнасці каталіцкіх брацтваў былі рэлігійныя практыкі. Размяжоўваць іх на прыватныя і брацкія было практычна немагчыма. Калектыўнае выкананне брацкіх рэлігійных абавязкаў таксама немагчыма было надзараваць, паколькі праводзіліся яны ў касцёлах, дзе ў іх маглі ўдзельнічаць як братчыкі, так і іншыя парафіяне. Аднак пад падазрэнне траплялі асобы, якія збіраліся для малітваў у прыватных дамах, як гэта было ў м. Мсцібаў Ваўкавыскага павету. Там у доме сялянкі Маргарыты Галасевіч было створана «тэрцыярскае брацтва», члены якога маліліся па «книгам секретным «не цензурным»[36]. У падобных выпадках братчыкі падвяргаліся пакаранням у выглядзе штрафаў.

Да канца XIX ст. пытанне аб дзейнасці брацтваў пры касцёлах паўставала некалькі разоў на губерніяльным узроўні[37]. Тычылася яно, перадусім, збору звестак пра наяўныя арганізацыі вернікаў і, ў выпадку іх выяўлення, правядзення карных мераў і закрыцця. Так, у рапарце Гродзенскага павятовага спраўніка адзначалася, што ў 1898 г. па павеце брацтвы дзейнічалі ў Луненскім, Валпянскім і Вяліка-Эйсмантаўскім касцёле. Ваўкавыскі павятовы спраўнік даносіў аб адным брацтве пры Мсцібаўскім касцёле з зазначэннем, што братчыкі «никакой вредной деятельности не ведут»[38]. У 1899 г. Слонімскі павятовы спраўнік даносіў Гродзенскаму губернатару аб асобах, якія «могут быть отнесены к категории братчиков»[39].

Дзейнічалі яны, згодна з рапартам спраўніка, пры Слонімскім, Ружанскім, Дварэцкім, Дзятлаўскім і Косаўскім касцёлах, прычым «брацкая» дзейнасць пералічаных асобаў абмяжоўвалася выключна дапамогай святару падчас набажэнстваў. Прадстаўленыя Гродзенскаму губернатару звесткі дазволілі яму сцвярджаць, што «в тех местах, где ксендзы более на виду терциарские общества не встречаются, а существуют они преимущественно в центрах более глухих и главным образом при таких костёлах, в которых настоятелями являются ксендзы, особенно известные своею политическою окраскою»[40].

У чарговы раз пытанне аб дзейнасці брацтваў паўстала ў 1905 г. у сувязі з выданнем указу аб верацярпімасці. У жніўні 1905 г. з дэпартамента духоўных спраў былі разасланыя лісты да губернатараў, з просьбай аб прадстаўленні звестак аб наяўных у падведамых ім губернях брацтвах[41], аднак на той момант брацтваў на беларускіх землях практычна не засталося. Так, па звестках павятовых спраўнікаў Мінскай губерні ў губерні не было аніводнага брацтва[42]. У Віцебскай губерні брацтвы былі выяўлены пры некаторых касцёлах (Прэльскім, Варкаўскім, Рушонскім, Біржагольскім і Аглонскім – на сённяшніх латвійскіх землях)[43]. Да брацтваў залічваліся таксама тэрцыяркі, якімі, на думку спраўнікаў былі пабожныя жанчыны а таксама асобы, акія пражывалі ў касцёльных багадзельнях, што таксама не заўсёды адпавядала рэчаіснасці.

У 1911 г. Магілёўскі мітрапаліт В. Ключынскі ў сваім мемарандуме спрабаваў вярнуць каталіцкаму касцёлу права ў галіне заснавання брацтваў, сцвярджаў аб неабходнасці іх дзейнасці, а таксама заклікаў улады не перашкаджаць існаванню наяўных пры касцёлах брацтваў, як і стварэнню новых. Сваю просьбу мітрапаліт абгрунтоўваў менавіта тым, што мэтай брацтваў з’яўляецца «внутренняя религиозная жизнь верующих. Никаких других обязанностей, кроме стремления к самоусовершенствованию, никаких других практик, кроме известных молитв, а иногда и постов, они не налагают. Ни одно из этих братств не преследует какой-либо политической цели, ибо в таком случае братство не было бы одобрено Главою Церкви»[44]. Аднак у адказе на вышэйзгаданы мемарандум, міністр унутраных спраў А. Макараў адзначыў, што дзейнасць каталіцкіх брацтваў можа быць магчымай толькі пры дазволе з боку Міністэрства ўнутраных спраў[45].

Падсумоўваючы, адзначым, што дзейнасць брацтваў ажыццяўлялася ў наступных накірунках: 1) малітоўная (прыналежнасць да брацтва абавязвала да рэгулярнай, вызначанай статутам малітвы і удзелу ў канкрэтных набажэнствах), 2) дапаможная (дапамога ў дагляданні за касцёлам, прыслужыванне святару падчас набажэнстваў), 3) дабрачынная (дзейнасць па аказанні дапамогі маламаёмаснаму насельніцтву – пераважна матэрыяльная і духоўная падтрымка). У адрозненне ад традыцыяў праваслаўнай царквы дзейнасць рымска-каталіцкіх брацтваў была інтравертнай і не выходзіла за рамкі сваёй канфесіі. Забарона дзейнасці рымска-каталіцкіх брацтваў на тэрыторыі Беларусі ажыццяўлялася ў рамках палітыкі, накіраванай на абмежаванне ўплыву каталіцкага касцёла пасля паўстання 1863–1864 гг., і не мела пад сабой выразных прычынаў.

[1] Bractwo // Encyklopedya kościelna. – Tom II. – Warszawa, 1873. – S. 556–557.
[2] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску (далей НГАБ (Мінск). Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 52543/ – Арк. 8 адв. – 9.
[3] Makarczyk J. Kustodia Grodzieńska zakonu braci mniejszych konwentualnych w latach 1687–1832. / J. Makarczyk. – Гродна: Гродзенская дыяцэзія рымска-каталіцкага Касцёла ў Рэспубліцы Беларусь, 2006. – 220 с.
[4] Wanat B.J. Zakon karmelitów bosych w Polsce / B. J. Wanat. – Kraków: Wydawnictwo OO. Karmelitów bosych, 1979. – S. 384–385, 464.
[5] Sitnik A.K. Bractwa religijne i tercjarstwo zrzeszone przy bernardyńskim kościele pw. Świętych Bernardyna ze Sieny i Andrzeja Apostoła we Lwowie (do 1785) / A. K. Sitnik // Studia franciszkańskie. – 2006. – ą 16. – S. 271.
[6] НГАБ (Мінск). Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 52543. – Арк. 8 адв. – 9.
[7] НГАБ (Мінск). Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1926. – Арк. 14 – 14 адв.
[8] Borejko Chodźko I. Diecezja Mińska około 1830 r. Cz. 1 Struktury parafialne / I. Borejko Chodźko. – Lublin: Instytut Europy Śródkowo-Wschodniej, 1998. – 213 s.
[9] НГАБ (Мінск). Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1926. – Арк. 103–112.
[10] НГАБ (Мінск). Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 52543. – Арк. 76–77.
[11] Makarczyk J. Prowincja litewsko-białoruska zakonu braci mniejszych konwentualnych w latach 1687–1845 / J. Makarczyk – Grodno: Grodzieńska Diecezja Rzymsko-Katolicka, 2012. – 555 s. – S. 189.
[12] О костёльных братствах. Оттиск из «Вестника Западной России». – 1868. – Кн. 3–5. – С. 11.
[13] Ганчар А. И. Римско-католическая церковь в Беларуси (вт. пол. XIX – нач. XX вв.). Исторический очерк / А. И. Ганчар. – Гродно, 2010. – С. 310; Valančius M. Namř užrašai / M. Valančius. – Vilnius: Baltos lankos, 2003. – 933 s.; Feliński Z. Pamiętniki / Z. Feliński. – Warszawa, 2009. S. 536.
[14] Ганчар А.И. Римско-католическая церковь в Беларуси (вт. пол. XIX – нач. XX вв.). Исторический очерк / А. И. Ганчар/ – Гродно, 2010. – С. 310; Makarczyk J. Kustodia Grodzieńska zakonu braci mniejszych konwentualnych w latach 1687–1832. /

J. Makarczyk. – Гродна: Гродзенская дыяцэзія рымска-каталіцкага Касцёла ў Рэспубліцы Беларусь, 2006. – 220 с.

[15]НГАБ (Мінск). Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 52543. – Арк. 10.

[16] НГАБ (Мінск). Ф. 1781. – Воп. 2. – Спр. 6522. – Арк. 23, 25.

[17] НГАБ (Мінск). Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1926. – Арк. 11.

[18] Там жа, арк. 7-8.

[19] НГАБ (Мінск). Ф. 1781. – Воп. 27. – Спр. 592. – Арк. 99.

[20] НГАБ (Мінск). Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1926. – Арк. 7-8, 54.

[21] Там жа, арк. 25.

[22] НГАБ (Мінск). Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 52543. – Арк. 10.

[23] НГАБ (Мінск). Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1926. – Арк. 48.

[24] Там жа, арк. 30.

[25] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродне (далей НГАБ (Гродна). Ф. 1. – Воп. 18. – Спр. 525. – Арк. 65.

[26] Kurczewskł J. Biskupstwo Wileńskie / J. Kurczewskł – Wilna: Nakładem i drukiem Józefa Zawadzkiego, 1911. – 614 s.

[27] НГАБ (Мінск). Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 52543. – Арк. 15; О костёльных братствах. Оттиск из «Вестника Западной России». – 1868. – Кн. 3–5. – С. 42.

[28] НГАБ (Мінск). Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 52543. – Арк. 15–18.

[29] НГАБ (Гродна). Ф. 1. – Воп. 6. – Спр. 543; НГАБ (Мінск). Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1926. – Арк. 1-1 адв.

[30] О костёльных братствах. Оттиск из «Вестника Западной России». – 1868. – Кн. 3–5. – С. 44.

[31] НГАБ (Мінск). Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 1926. – Арк. 6-6 адв.

[32] Там жа, арк. 16.

[33] НГАБ (Мінск). Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 52543. – Арк. 7.

[34] НГАБ (Гродна). Ф. 1. – Воп. 18. – Спр. 525. – Арк. 4.

[35] Ганчар А.И. Римско-католическая церковь в Беларуси (вт. пол. XIX – нач. XX вв.). Исторический очерк / А. И. Ганчар. – Гродно, 2010. – С. 305.

[36] НГАБ (Гродна). Ф. 1. – Воп. 18. – Спр. 525. – Арк. 28.

[37] Там жа,. арк. 1-2, 12.

[38] Там жа, арк. 4, 48.

[39] Там жа, арк. 12.

[40] Там жа, арк. 35.

[41] НГАБ (Мінск). Ф. 1430. – Воп. 1 – Спр. 46947; НГАБ (Мінск). Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 7596.

[42] НГАБ (Мінск). Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 7596.

[43] НГАБ (Мінск). Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 46947.

[44] Меморандум Могилёвского митрополита Викентия Ключинского и католических епископов (1911/1912) // Католическая церковь накануне революции 1917 г.: Сборник документов / Сост. М. Радван. – Люблин: Научное общество Католического университета в Люблине, 2003. – С. 444-445.

[45] Ответ министра А. А. Макарова на письмо митрополита В. Ключинского и начальников католических епархий (1912) // Католическая церковь накануне революции 1917 г.: сборник документов / Сост. М. Радван. – Люблин: Научное общество Католического университета в Люблине, 2003. – С. 452.

**SUMMARY**

***Raisa Zianiuk***

***Roman Catholic fraternal societies in the western provinces of the Russian Empire in the late 18th – beginning of 20th century***

*The article investigates the forms of Catholic fraternal societies in the western provinces of the Russian Empire in the late 18th – beginning of 20th century, main directions of its activities, as well as the policy of imperial authorities on the possibilities of the existence of given religious communities of believers.*
*Keywords: Roman Catholic church, fraternal societies, the Russian Empire, 18th century, 19th century, 20th century, western provinces.*

***Руслана ШЕРЕТЮК***

# Римо-католицький вектор місіонерської діяльності Російської православної церкви на Правобережній Україні в другій половині XIX ст.

*Проаналізовано засоби і методи місіонерської діяльності Російської Православної Церкви в Південно-Західному краї в другій половині XIX ст., спрямовані на обмеження впливу Римо-Католицької Церкви на автохтонне населення цих земель.*
*Ключові слова: Правобережна Україна, Російська Православна Церква, Римо-Католицька Церква, місіонерська діяльність, русифікація, конверсія.*

Після офіційного «возз’єднання» греко-уніатського населення Правобережної України з Російською Православною Церквою 1839 р. перед вищим церковним і світським керівництвом імперії постало не менш складне завдання зміцнення на цих теренах позицій «благочестя». Саме воно слугувало одним із найбільш дієвих інструментів наступної широкомасштабної акції російського царату, спрямованої на денаціоналізацію, русифікацію та остаточне, згідно з імперською ідеологічною програмою, злиття поліетнічного та поліконфесійного населення цього регіону з Російською імперією.

Вагомим внеском вітчизняної історичної науки у висвітлення питання трансформацій релігійно-церковного життя Правобережної України в другій половині XIX ст. стали наукові праці Б.Бойка, О.Буравського, С.Жилюка, А.Колодного, В.Лось, О.Сагана,